


## І ЗЛОЎЛЕНЫ, І... НЕ ЗЛОДЗЕЙ?

Кожную пятніцу чытаю ў газеце новыя «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», потым старанна ўспамінаю сваё жыццё, і да болю крыўдна: горычы ў ім — як той казаў, з галавой, а вось каб нечага смешнага, дык, здаецца, і няма. Хіба...

Было гэта ў самым пачатку далёкіх дзевяностых. Тады, каб не дапусціць павальнай галадухі ды адцягнуць людзей ад палітыкі, многім сталі даваць па пяць сотак зямлі на няўдобіцах і тым самым падштурхоўваць да будаўніцтва дач.

Нам з жонкай яно не свяціла, бо грошай не мелі зусім. Але ж потым сталі даходзіць чуткі, што начальства актыўна бярэ крэдыты. Дык можа — падумалі — і нам паспытаць таго шчасця? А што — абое працуем, не зломкі, да зямлі і сялянскай працы прывычныя. Значыць, нешта вырасцім, сэканомім, глядзіш — і з крэдытам разлічымся.

З такімі намерамі, хоць без асаблівых надзей, звярнуўся я ў прафкам і...

Цуды такі здараюцца: мне, у так званым «парадку выключэння», выдзяляюць участак, даюць крэдыт у памеры трох тысяч рублёў — яшчэ тых!.. А далей — круціся, як хочаш.

Мы з жонкай адразу ж «паднялі» радню, і не марна: дзякуючы ёй праўдамі-няпраўдамі прыдбалі дзелавой драўніны, склалі зруб, перавезлі на свой участак — паставілі дамок.

Наступная праблема — дзверы і вокны, столь і падлога. На іх, як вядома, патрэбны дошкі. А дзе іх браць, калі ў продажы нічога?

І зноў падарунак лёсу: тэлефануюць сваякі, дошкі — прычым з лістоўніцы — прадаюцца ў Наваполацку, і за бясцэнь, можна сказаць, бо ніхто не купляе. А мне ж яны — як паветра, на дачу прывёз — і нацешыцца не магу: 4–6 сантыметраў у таўшчыню, шырачэзныя, цэлы МАЗ з прычэпам...

Згрузілі мы іх побач з домам і агароджай (за ёй — ужо іншы кааператыў). Праз колькі дзён скарысталі — паклалі падлогу, потым прыехалі, каб узяцца за столь. Аж тут — нечаканка: галавешка, якой намазвалі шнур для адбіўкі ліній, замокла пад дажджом. Іншай няма. Значыць, трэба вогнішча распальваць, новую «рабіць» і столькі часу змарнаваць...

Азірнуліся мы з хлопцамі — знюхалі дым: ура, гарыць-такі вогнішча, прычым блізка — за агароджай у суседнім кааператыве.

Я хуценька туды. Гаспадар — чую — у падвале нешта габлюе. Іду на гук, расчыняю дзверы і... заміраю: дошка, якую ён трымае ў руках, — тоўстая, шырокая, з лістоўніцы — мая.

Нейкі час мы глядзім адзін на аднаго. І ён урэшце здаецца першы — патрабуе:

— Ну, гавары ўжо!

А я, можа, і рады б нешта сказаць, але што?

— Ды вось, — кажу, сумеўшыся, — прыйшоў галавешкі прасіць.

— А-а-а... Калі так, то бяры, — з палёгкай уздыхае сусед.

І я недзе праз хвіліну ўжо вяртаюся на сваю будоўлю, аддаю майстрам патрэбную галавешку — абрэзак з маёй дошкі — як той казаў, да бабкі не хадзі!

На добры толк, трэба было ўчыніць разборкі — ну хоць папалохаць злодзея. Але ж, па-першае, час марнаваць не хацелася, а па-другое...

Як нам тады здавалася — усе жылі ў нястачы, вось і мусілі красці...

Карацей, як нічога ніякага, мы ўзяліся за працу.

Адзінае, покуль жыў той сусед, мы з ім ніколі не размаўлялі: нас раздзяляла агароджа і нешта іншае, куды вышэйшае.

**Іван АСТРОЎСКІ,**

*г. Мінск.*

## КУЛЬТУРНАЯ КОТКА

Дзяўчаты, жанчыны любяць катоў і котак. Тыя, падобна, плацяць ім узаемнасцю. Таму — зусім не дзіва, што аднойчы да будынка гарадской бібліятэкі, дзе калектыў, як ні круці, жаночы, прыбілася котка з параненай лапкай і сустрэла там поўнае разуменне. Яе накармілі, абмылі, абагрэлі, знасілі да спецыяльнага доктара, забяспечылі належны догляд...

Карацей, Фрося (назавём яе так), пакуль была на лячэнні, перакаланася, што новыя гаспадыні жадаюць ёй толькі дабра і з імі, вось такімі, ёй грэх не застацца. Супраць гэтага нават дырэктар нічога не меў, праўда, з адной умовай, што котка будзе пад пільным наглядам.

Фрося, падобна, гэта пачула і таму ніякіх гадасцяў нікому не рабіла. Больш за тое, з часам яна стала свайго роду магнітам установы. Як зараз бачу: пераступаеш парог, а яна — чорная, вальяжная — ляжыць на радыятары. Хто хоча, можа нават пагладзіць, пакратаць яе за вушкі. І ўсё ж...

Бібліятэка — не заапарк, утрымання жывёл там зусім не вітаецца, наадварот — добры наганяй можна атрымаць ад розных правяральшчыкаў.

Жанчыны ведалі гэта і таму спачатку пры з'яўленні некага з чужых котку запіралі ў каморы, а потым Фрося сама, знюхаўшы ў будынку салідных дзядзькоў, на ўсякі выпадак сыходзіла. Але ж аднойчы...

Неяк раз калектыў бібліятэкі выбіўся ў лідары: з нагоды ўручэння, здаецца, нейкага дыплома і грашовай прэміі там ладзіўся ўрачысты сход, а потым і фуршэт, дзе галоўным госцем павінен быў стаць нядаўна прызначаны кіраўнік упраўлення культуры. Хто такі — строгі ці добры, справядлівы ці самадур — інфармацыі ніякай (гэта зараз у інтэрнэт зайшоў — і ледзь не ўсю паднаготную знаеш, а тады...). Жанчынам «шапнулі» хіба тое, што катоў госць любіць...

І вось урачысты збор.

Фрося самахоць нікуды не сышла. І ў камору яе (хай будзе што будзе!) ніхто не занёс. А таму, развалі́ўшыся ў куце, яна выслухала ўсіх выступоўцаў, потым, пераканаўшыся, што ў зале свае, захацела пакрасавацца: паволі, кругам абышла сталы, агледзела павесялелых бяседнікаў, пацерлася ля ног у высокага госця. «Трэба было б шуганусь», — падумаў тады начальнік. Але зрабіць гэта можна было нагой, што, вядома ж, нядобра: гаспадыні могуць пакрыўдзіцца.

Пакуль госць вось так разважаў, Фрося... ускочыла яму на калені, і зараз іншага выйсця ўжо не было — з коткай давялося змірыцца і нават пагладзіць.

...Размовы пра той фуршэт хадзілі потым доўга. У бібліятэцы ўсе казалі, што новы начальнік — чалавек безумоўна вельмі культурны.

І той, у сваю чаргу, мусіў прызнаць, што працуе калектыў добра, што ўзнагарода і прэмія прысуджаны справядліва. А што Фрося ў памяшканні жыве, дык гэта як паглядзець: можа, перагіб, а можа, і наватарства. Кніжкі цалейшыя будуць.

**В. Ж.,**

*г. Жодзіна.*

## СКАЖАШ — НЕ ВЕРНЕШ...

Некалі ў мястэчках, райцэнтрах і вялікіх гарадах (не кажучы пра вёску) на дармавое жыллё ніхто не спадзяваўся. Вярталіся хлопцы з арміі, жаніліся, нараджалі дзяцей і самі думалі пра ўласны кут. У нас у Крычаве цэлыя вуліцы тады з'яўляліся. Будаваліся хто як мог: хто з дрэва хаціну ставіў, хто з цэглы ці шлакабетону, прычым навыперадкі...

Адзін прымак таксама падумаў, што не век жа яму з цешчай ды шваграмі жыць, таксама заліў падмурак. А вось з чаго сцены ўзводзіць, калі гол як кол і жонка не багацейка, — гэта пытанне было.

Адказ на яго само жыццё падказала. У горадзе сталі новы бетонны мост над рэчкай будаваць, а драўляныя шчыты са старога прадавалі зусім за бясцэнь. Людзі на дровы іх бралі, а гэты прымака надумаўся хаціну паставіць. Пякельная была справа разабраць тыя шчыты: брусы мацаваліся намертва... Гаспадар і два швагры, можна сказаць, рук не пакладалі, а ўжо колькі поту пралілі...

Не марна, дзякаваць богу: вось ужо і зруб стаіць, і крохвы прымацаваны.

Прымака рады быў, у час работы амаль не змаўкаў, усё нешта баяў. Аднойчы — да слова прыйшлося — расказаў, што ў сям'і ў яго былі хворыя на сухоты. І чым тады не лячыліся: і травамі, і барсуковым здорам, а найлепей сабачае мяса памагло...

Хлопцы калі слухалі тую балбатню, калі не, але ж нешта ў памяці засталася.

І вось настаў той дзень, калі шыфер куплены, калі гаспадар знізу падае лісты ды камандуе, а хлопцы ўверсе іх прыбіваюць. Гонкая справа, пацешная... Гаспадыня ежу на аб'ект прынесла, на абед не дачакаўшыся.

Хлопцы селі есці. Апетыту, вядома ж, не займаць — ва ўсіх аж за вушамі трашчыць, а тым больш калі ў місках тушаная бульба з мясам. І тут...

Хто ж ведае, што стрэліла ў галаву таму прымаку, але ён раптам ляпнуў: «Гаў!» А потым і двойчы паўтарыў.

Старэйшы са шваграў быў надта ўразлівы, збялеў, кінуў міску, адскочыў...

Малодшы — сам па сабе мацнейшы і здароўем, і характарам, але ж і ён пакрыўдзіўся, брата да слёз пашкадаваў.

Абодва, карацей, кінулі есці і кінулі рабіць. Горш за тое, малодшы пад раніцу вызлізнуў з хаты і разам з сябрамі (яны звечара згаварыліся) зняў з новай хаты два рады шыферу.

Прымака назаўтра, вядома ж, здагадаўся, хто гэта зрабіў, — паспрабаваў быў сілу паказаць, а не выйшла. Уся сям'я супраць яго аб'ядналася, нават жонка сказала: «Трэба было думаць, што гаварыць, а што не... Сабачнік!»

Вось на гэтым і скончылася ў хаце прымакова ўлада. А мянушка, наадварот, — толькі з'явілася: інакш, як сабачнікам, чалавека ніхто не зваў. І «званне» гэта не адмыць было, не адрэзаць, бо і сапраўды: «Адсячэш — не прытачыш, скажаш — не вернеш».

**Л. ЧЫГРЫНАВА,**

*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Водар халоднай вясны

### Веданне, якое сёння патрэбна нам усім як ніколі

ГЭТЫ загаловак нарадзіўся адразу, як толькі ўбачыла фотаздымак, які для першай паласы прапанаваў наш фотамайстар Анатоль Кляшчук. Ну, вы памятаеце гэтае фота ва ўчарашнім нумары: малое ў шапцы, шаліку і рукавічках нюхае галінку вішні, усыпаную бялюткімі кветкамі. Нешта ў гэтай карціне — пэўна, ледзь не зімовае адзенне, якое не вельмі стасуецца з вясновай квеценню, — такое кранальнае, цёплае, здаецца, сапраўды адчуваеш, як у настылым паветры лунае гаркаваты водар вішнёвых костачак...

Увогуле, гэтай вясной пахі — рэч надзвычай, як ніколі, важная. Бо, як вядома, адным з адметных сімптомаў каранавіруса, які адрознівае гэту заразу ад іншых падобных інфекцый, з'яўляецца поўная страта нюху. І, хочаш таго ці не, раніцу пачынаеш з таго, што ўдыхаеш на поўную моц «камунальныя пахі» — мыла, зубной пасты, зваранай кавы, падгарэлага ў тостары хлеба, смажанага сала з суседняй кватэры (нацягвае праз адкрытую на балконе фортку). І — ці не ўпершыню ў жыцці радуешся таму, што іх адчуваеш. Але насамрэч чакаеш іншай радасці — той, якая штогод на пачатку мая ахінае з ног да галавы і нібы закалыхвае прадчуваннем нечага незвычайнага, абавязкова добрага, несумненна, сапраўднага. Чакаеш водару вясны, які ў горадзе магчыма адчуць толькі фрагментарна, намёкам — у парку ці ў старым зацішным двары, дзе ў якім закутку прытулілася скручанае дрэўца.

ІНШАЯ рэч — у вёсцы. Там у гэты водар ты пагружаешся ўвесь і адразу, нечакана, бы ныраеш проста з машыны ў нешта шчыльнае, што, здаецца, можна рэзаць на кавалкі і мацаць рукамі. Пасля, крыху ачомаўшыся, пачынаеш адрозніваць нюансы, дэталі, угадваць знаёмыя з маленства пахі. Вось гэта пахнуць старыя чарнаслівы — усе бялюткія, значыць, калі, дасць бог, не будзе моцных замаразкаў і квецень не асыплецца, зноў увесь двор у жнўні будзе ўсеяны цёмна-фіялетавымі буйнымі пацеркамі, і зноў мы іх будзем старанна збіраць, выпутваць з травы, бо мала што ёсць смачнейшае за чарнасліўы-апады, а ўжо варэнне з іх — дакладна самае смачнае з усіх вядомых. А вось гэта — перапрэлае лісце на клумбе пасярод двара. Мы яго ўвосень зграбаем у кучу, каб імправізаваны кветнік не дзірваneў. Пасля лісце ідзе ў якасці ўгнаення на грады, а на клумбе разам з малымі сеем па крузе аксамiткі. Па краях — нізенькія, барвова-аранжавыя, а ў сярэдзіне — вышэйшыя, вастралістыя, з зусім дробненькімі жоўтымі і чырвонымі кветачкамі. Па цэнтры мы летась укінулі некалькі зярнят дэкаратыўнага сланечніку, Медзведзяня Тэдзі сорт называецца. «Медзведзяняты» выраслі невысокія, ярка-жоўтыя, надзвычай пушыстыя і ў атачэнні аксамітак глядзеліся вельмі нават прыгожа. Сёлета пакецік з іх насеннем разам з іншымі ўжо чакае свайго часу.

З суседняга двара павявае настылай за зіму ў склепе бульбай — яе высыпалі на паветра, каб пагрэлася і проста правятрылася перад пасадкай. Да гэтага паху дадаецца насычаны пах пыльнай мешкавіны — найлепш водар дзяцінства, бо гэта значыла, што бульба насыпаная ў мяшкі і мы зараз з бацькам павязём яе на поле, дзе чакаюць саджальніцы. І можна будзе пакарміць з рукі рахманага каня — ён далікатна будзе браць бульбіны цёплымі мяккімі губамі, а пасля тата абавязкова дасць пакіраваць, і ты будзеш сціскаць у далонях шурпатыя лейцы, тузаць іх, весела пакрыкваць «но!», і гэта будзе ці не першае ў жыцці тваё адчуванне таго, што нешта і нехта ад цябе, ад тваіх дзеянняў залежыць. Адчуванне адказнасці, якое пранясеш праз дзясяткі гадоў, як і дотык тых шурпатых лейцаў у далонях.

ПАХНЕ сваім, адмысловым пахам нечапаная яшчэ зямля на агародзе. Гэта, бадай, самы прыцягальны водар вясны, бо ты ўжо ўяўляеш, як хутка, вельмі хутка, можа, нават заўтра, разварушыш гэты застылы ў чаканні папар рыдлёўкай і граблямі, паробіш барозны і грады, на якіх у роўненькія радкі ўкінеш насенне. І пасля як за самым вялікім дзівам (штогод адно і тое, але дзіва не становіцца меншым) будзеш назіраць, як з'яўляюцца ў зямлі маленькія зялёныя «дзюбкі», як яны становяцца лісцікамі, дужэюць, растуць. І ты кожны раз адчуваеш сябе прычыненым да гэтага дзіва, і менавіта дзеля гэтай прычыненасці кожную вясну гнеш перад зямлёй спіну. А на тых, хто здзіўляецца: маўляў, навошта, грошы ж зарабляеш неблагія, усё можна купіць на базары ці ў краме, — глядзіш са шкадаваннем. Бо яны не разумеюць ці не самага галоўнага (а можа, і самага галоўнага) у гэтым жыцці, і як іх не пашкадаваць?

Пахне ад рэчкі светла-зялёнымі парасткамі аеру, сакавітымі, прыемнымі на смак, і пупышкамі лотаці, якая вось-вось па ўсёй балацянцы пстрыкне жаўцюткімі кветкамі, і тады ў старых вербах пачнуцца салаўіныя канцэрты, і ўся рэчка будзе цёхкаць і свістаць на розныя лады, і ўначы будзеш прачынацца ад гэтай надзвычай меладычнай і стройнай какафоніі ўзнёсла-шчаслівы, як перад першым спатканнем у далёкім юнацтве...

ВЯСНА, нават такая халодная, як сёлета, пахне тым, што абавязкова спраўдзіцца і абавязкова будзе. Веданне, якое сёння патрэбна нам усім як, бадай, ніколі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**